# ЯЗЫК И ЛИТЕРАТУРА КАК ГЛАВНЫЕ ДУХОВНЫЕ ЦЕННОСТИ: СОЦИОКУЛЬТУРНЫЙ, ЛИНГВОКУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЙ, КОГНИТИВНЫЙ И ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ АСПЕКТЫ

## КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ Ў АЙЧЫННАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ НАВУЦЫ: СТАНАЎЛЕННЕ ПАНЯЦЦЯ

*В.І. Андрэйчык*
*Мінск, ДУА "Акадэмія адукацыі"*

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый вучняў з'яўляецца асноўнай мэтай сучаснай адукацыйнай сістэмы, што вызначана дзяржаўным адукацыйным стандартам. Змест дакумента накіраваны на фарміраванне асобы, якая гарманічна спалучае нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці, дэманструе маральна-этычную сталасць, грамадзянскую адказнасць, здольнасць да паўнацэннага ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем [1, с. 114]. *Мэта артыкула:* аналіз паняцця *каштоўнасныя арыентацыі* ў педагагічнай навуковай літаратуры, вызначэнне этапаў яго развіцця ў кантэксце беларускай моўнай адукацыі

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам артыкула паслужылі навукова-метадычная літаратура па праблеме даследавання, нарматыўна-прававыя дакументы сферы адукацыі. Для дасягнення мэты даследавання выкарыстаны наступныя метады: аналіз навуковых крыніц, параўнальны аналіз зместу адукацыйных праграм і падручнікаў, сістэматызацыя тэндэнцый моўнай адукацыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Педагагічная навука XX–XXI стагоддзяў вызначае каштоўнасныя арыентацыі як складанае міждысцыплінарнае паняцце, якое ўключае ў сябе шматлікія аспекты розных сфер. Каштоўнасці разглядаюцца як фундаментальная аснова адукацыі, акцэнт робіцца на вызначэнні базавых каштоўнасцей, неабходных для гарманічнага развіцця асобы. Даследаванне гэтага пытання патрабуе рэтраспектыўнага аналізу адукацыйных праграм, падручнікаў і нарматыўных дакументаў, што адлюстроўваюць дынаміку адукацыйных прыярытэтаў [2, с. 7]. У развіцці методыкі навучання беларускай мовы, як адзначае прафесар М.Г. Яленскі, вылучаюцца тры ключавыя этапы: 1920–1930-я, 1940–1980-я і канец XX – пачатак XXI стагоддзя [3, с. 4].

На першым этапе, *у 1920–1930-я гады, пачынаецца фарміраванне моўнай адукацыйнай практыкі.* У цэнтры ўвагі першых праграм і падручнікаў знаходзяцца нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці. Асаблівая ўвага надаецца сацыяльным эталонам, арыентаваным на актыўны ўдзел вучняў у грамадскім жыцці. Выдаюцца комплексныя навучальныя праграмы, якія актуалізуюць неабходнасць калектыўнай працы і падрыхтоўкі вучняў да грамадскай дзейнасці.

У тэкстах падручнікаў акцэнтуецца выхаванне патрыятызму, працавітасці, развіццё культуры і валоданне беларускай мовай як асновы для актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Так, аўтары В. Астроўская, І. Пратасевіч, І. Самковіч, Я. Лёсік засяроджваюць увагу на ідэалах, якія спрыяюць сацыялізацыі асобы: патрыятызм, праца на карысць і дабрабыт Радзімы, развіццё культуры. Напрыклад, у выданні "Рабочая кніга па беларускай мове: сістэматычны курс марфалогіі і элементы сінтаксісу" (1928) І. Пратасевіч і І. Самковіч вылучаюць "актыўнасць і самадзейнасць вучняў" як эфектыўны метад навучання" [4, с. 3]. Падручнік адлюстроўвае ключавыя каштоўнасныя арыентацыі свайго перыяду: паважаць родную мову, краіну, грамадства, сям'ю і бацькоў; садзейнічаць аб'яднанню горада і вёскі; адказна ставіцца да працы. Падкрэслівалася

перавага калектыўнай працы і ролі дзяржавы, у якой сяляне і рабочыя сумесна пераадольваюць цяжкасці і будуюць новае жыццё: "*Наша краіна завецца Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка. Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку пабудавалі рабочыя і сяляне. Згодна жывуць паміж сабой селянін і рабочы ў рэспубліцы Саветаў. Яны перамаглі сваіх ворагаў, будуюць новае жыццё*" [4, с. 7].

У 30-я гады XX стагоддзя вітаецца будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, уключэнне політэхнічнага навучання ў камуністычнае выхаванне. Пастанова ЦК ВКП(б) ад 25 жніўня 1932 года "Аб вучэбнай праграме і рэжымах у пачатковай і сярэдняй школе" задае практыкаарыентаваны падыход у адукацыі, фармулюе задачы выхавання самастойнасці і актыўнасці вучняў. У гэтых каардынатах распрацоўваецца праграма па беларускай мове для політэхнічнай школы (К. Шапялевіч, І. Пратасевіч, А. Багдановіч, 1932), у якой падкрэсліваецца, што моўная культура з'яўляецца часткай палітыкі пралетарыяту.

У перыд 20–30-х гадоў XX стагоддзя галоўнай мэтай камуністычнага выхавання абвяшчаецца падрыхтоўка адукаванай моладзі, адданай сацыялізму, ідэям будаўніцтва новага грамадства, здольнай прымяняць веды на практыцы, карыстацца тэхнікай. У гэтым кантэксце фарміруюцца каштоўнасныя арыентацыі вучняў у духу камуністычных ідэалаў.

*У перыяд 1940–1980-х гадоў фарміруецца савецкая сістэма моўнай адукацыі*. У цэнтры ўвагі школы знаходзіцца сацыяльнае развіццё вучняў, бесперапыннае навучанне і даследчая дзейнасць. Падкрэсліваецца каштоўнасць беларускай мовы як сродку зносін і культурнага самавызначэння асобы. У тлумачальнай запісцы да праграмы па беларускай мове (1951) сцвярджаецца, што без агульнай мовы, зразумелай для ўсіх, грамадства губляе здольнасць да развіцця.

У гэты час выдаецца падручнік "Беларуская мова 5–6 класы" (1965) У.К. Андрэенкі і М.С. Яўневіча. Аўтары падкрэсліваюць ролю мовы ў развіцці навукі, тэхнікі і культуры народа. Ключавыя словы і паняцці гэтага часу – савецкая армія, камунізм, праца, савецкі народ: *"Савецкі народ на ніве мірнай працы стварае сапраўдныя цуды. Мы будуем магутныя электрастанцыі, самыя складаныя машыны, асвойваем космас"* [5, с. 42]. Школьныя выданні ідэалізуюць каштоўнасці мірнага жыцця і працы пры сацыялізме, агульнапрынятыя грамадскія ідэалы: паляпшэнне дабрабыту, развіццё навукі, тэхнікі і культуры.

У 1940–1980-х гадах тэксты падручнікаў паслядоўна фарміравалі калектыўную адказнасць і сацыяльную актыўнасць. Адукацыя і выхаванне ўспрымаліся як непарыўныя паняцці, працоўнае выхаванне займала цэнтральнае месца ў навучальным працэсе. Асаблівая ўвага надавалася адносінам да мовы як культурнага і сацыяльнага феномена. Каштоўнасныя арыентацыі з'яўляліся асновай савецкага выхавання, спрыялі гарманічнаму спалучэнню ідэйнай і практычнай падрыхтоўкі да жыцця.

*Канец XX–пачатак XXI стагоддзя* (*найноўшы перыяд*) адзначаецца рэфармаваннем адукацыйнай сістэмы ў Беларусі. Распрацоўваецца "Канцэпцыя моўнай адукацыі ў сярэдніх навучальных установах" (аўтары Л.А. Мурына, В.У. Протчанка, П.П. Шуба), якая акцэнтуе ўвагу на развіцці інтэлектуальных здольнасцей вучняў, выхаванні творчай асобы і фарміраванні навыкаў пісьма. У новых праграмах актуалізуецца значэнне беларускай мовы як дзяржаўнай каштоўнасці і культурнага здабытку нацыі.

Праграма 2010 года вылучае прыярытэты моўнай адукацыі: грамадзянскасць, патрыятызм і павага да нацыянальнай спадчыны. Вучань абвяшчаецца актыўным суб'ектам навучання, асноўнай задачай фармулюецца фарміраванне цэласнага ўспрымання мовы як культурна-грамадскай з'явы [6, с. 42]. Новая канцэпцыя вучэбнага прадмета "Беларуская мова" (2009) засяроджвае ўвагу на асэнсаванні беларускай мовы

як нацыянальнай і агульначалавечай каштоўнасці, на развіцці здольнасцей выкарыстоўваць беларускую мову ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

Сучасныя праграмы (2024) накіраваны на развіццё маўленчых навыкаў і фарміраванне культурных і сацыяльных каштоўнасцей вучняў. Асноўная ўвага надаецца разуменню мовы як феномена культуры, засваенню сацыяльных норм і каштоўнасцей беларускага народа. Праграмы актуалізуюць задачу фарміравання патрыятызму, нацыянальнай ідэнтычнасці, грамадзянскасці, здольнасці да самаразвіцця, супрацоўніцтва і эфектыўнай камунікацыі ў розных маўленчых сітуацыях.

Сучасны этап развіцця моўнай адукацыі вызначаецца стварэннем канцэпцый навучання, адукацыйных стандартаў і дыдактычных матэрыялаў для сярэдняй адукацыі (Г.М. Валочка, Л.С. Васюковіч, В.У. Зелянко, В.П. Красней, Я.М. Лаўрэль, В.І. Несцяровіч, В.У. Протчанка, В.Ф. Русецкі, І.М. Саматыя, С.А. Язерская, С.М. Якуба, М.Г. Яленскі і інш.). Асноўным арыенцірам з'яўляецца фарміраванне вучня як носьбіта нацыянальных і сусветных каштоўнасцей, патрыёта і грамадзяніна.

Так, прафесар В.У. Протчанка адзначае, што "мова адлюстроўвае нацыянальную культуру і з'яўляецца формай яе існавання" [7, с. 19]. На думку вучонага, моўная адукацыя спрыяе духоўнаму развіццю асобы, засваенню сацыяльна-культурнага вопыту беларускага народа. Асаблівая ўвага надаецца фарміраванню мыслення, паводзін, павагі да нацыянальнай культуры як аснове гарманічнага грамадства.

У працах М.Г. Яленскага вылучаецца як прыярытэтнае асобасна арыентаванае навучанне, прызнаецца каштоўнасцю непаўторнасць, індывідуальнасць дзіцяці. Асобасны падыход грунтуецца на цэласнасці асобы, уліку яе патрэбнасцей, здольнасцей і агульначалавечых здабыткаў. Адукацыя выступае як працэс раскрыцця індывідуальнага патэнцыялу.

У сучаснай моўнай адукацыі паняцце каштоўнасці звязана з аксіялагічным падыходам (Г.М. Валочка, А.Д. Дзейкіна, В.Ф. Русецкі і інш.). Аксіялагічны падыход выступае адным з прыярытэтных напрамкаў, скіраваных на фарміраванне і засваенне сістэмы каштоўнасцей у роднамоўным і дзяржаўным кантэксце. Гэты працэс уключае ўсведамленне вучнем ідэнтычнасці, фарміраванне патрыятызму, адказнасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі [8, с. 15].

**Заключэнне**. Аналіз працэсу развіцця моўнай адукацыі ў Беларусі дэманструе: фарміраванне каштоўнасных арыентацый вучняў на кожным этапе развіцця моўнай адукацыі заўсёды адпавядала грамадскім запатрабаванням і культурным ідэалам свайго часу. У 1920–1930-я гады акцэнт рабіўся на засваенні беларускай культурнай спадчыны, выхаванні патрыятызму і сацыяльнай адказнасці. У 1940–1980-я гады савецкая сістэма моўнай адукацыі акцэнтавала ўвагу на калектыўным працоўным выхаванні. Канец XX– пачатак XXI стагоддзя характарызуецца рэформамі, накіраванымі на фарміраванне нацыянальнай ідэнтычнасці, павагі да беларускай мовы і культуры. Асобасна арыентаванае навучанне спрыяе гарманічнаму развіццю асобы, яе творчай самарэалізацыі і сацыяльнай інтэграцыі. Прыярытэт надаецца духоўнаму станаўленню вучняў і пераемнасці сацыяльна-культурнага вопыту, рэалізацыі інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу навучэнцаў.

1. Образовательный стандарт общего среднего образования: постановление Министерства образования Республики Беларусь, утв. 26.12.2018 г., № 125 [Электронный ресурс] // Национальный образовательный портал / Национальный институт образования. – Минск, 2018. – Рэжым доступу: https://adu.by/images/2023/obr/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf – Дата доступа: 10.01.2025.

2. Васюковіч, Л. С. Лінгваметадычная канцэпцыя вучэбнага тэксту: рэтраспектыўны, тэарэтыка-арыентаваны і практыка-арыентаваны аспекты: манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2015. – 192 с.

3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах: вучэбны дапаможнік / Н.М. Антановіч [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Вышэйшая школа, 2022. – 263 с.

4. Пратасевіч, І. Рабочая кніга па беларускай мове: сістэматычны курс марфалогіі і элементы сінтаксісу / І. Пратасевіч, І. Самковіч. – Менск: Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – 156 с.

5. Яўневіч, М.С. Беларуская мова. Ч. 1. Фанетыка і правапіс, марфалогія / М.С. Яўневіч, У.К. Андрэенка. – Мінск: Народная асвета, 1965. – 210 с.
6. Беларуская мова: V – XI класы: вучэб. праграма для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навуч. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010. – 56 с.
7. Протчанка, В.У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове: манаграфія / В.У. Протчанка. – Мінск: НІА, 2001. – 211 с.
8. Дейкина, А.Д. Аксиологическая методика преподавания русского языка: монография / А.Д. Дейкина. – М.: МПГУ, 2019. – 281 с.

# ОБУЧЕНИЕ БЕСПЕРЕВОДНОМУ ПОНИМАНИЮ СЛОЖНЫХ СЛОВ В ПРОЦЕССЕ ФОРМИРОВАНИЯ УМЕНИЙ ЧТЕНИЯ БЕЗ СЛОВАРЯ НА АНГЛИЙСКОМ ЯЗЫКЕ

*Л.И. Бобылева*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Эффективное решение вопросов профессионального иноязычного образования требует проведения фундаментальных и прикладных научных исследований, направленных на разработку психологических, дидактических, методических и лингвистических основ обучения в контексте личностно-ориентированной образовательной парадигмы. Одним из направлений профессиональной подготовки специалиста является формирование коммуникативной компетенции, которая обеспечивается способностью понимать и продуцировать информацию в соответствии с условиями речевой коммуникации. В этой связи развитие умений беспереводного понимания текстов на основе языковой догадки являются важным для обучения профессионально-ориентированному иноязычному чтению.

Цель исследования – лингвистический анализ сложных слов английского языка и разработка методических рекомендаций по развитию языковой догадки в процессе их семантизации.

**Материал и методы.** Источниками исследования послужили научные работы по лингводидактике и методике преподавания иностранных языков в рамках обсуждаемой проблемы, методы контекстуального анализа и интерпретации, а также результаты опытного обучения, проведенного с группой магистрантов на базе ВГУ имени П.М. Машерова (специальность «Образовательный менеджмент»).

**Результаты и их обсуждение.** Возможность понимания неизученных лексических единиц зависит от способности учащихся переносить знания и умения в новые условия, при этом подобный перенос предполагает умения осмысливать информацию, владеть разветвленной системой мыслительных операций (анализ, синтез, индукция, дедукция, умозаключение и др.). В связи с этим возникает проблема разработки приемов обучения таким умениям.

В современном английском языке способ образования слов на основе словосложения является одним из самых распространенных. Составные части сложных слов могут соединяться напрямую (*bookseller*), через дефис (*kind-hearted*), посредством предлога (*easy to follow*). При этом можно выделить следующие типы сложных слов на основе принципа их словообразования: 1) образованные посредством соединения основ (например, *fingerprint)*; 2) слова, которые задействуют не только словосложение, но и суффиксацию и конверсию (например, *tight-fisted, startup*) [1, с. 60].

Лингвистический анализ сложных слов позволил определить факторы, определяющие возможность их беспереводного понимания. К их числу следует отнести: 1) структурная прозрачность составляющих компонентов, т.е. их полное соответствие знакомым базовым словам (*trademark*); 2)возможность соотнесения со знакомым базовым словом и переосмысления значения нового сложного слова на основе контекста (*home-made*